ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
27
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 4 (1380)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### САВЕТ ФГП

на чарговым пасяджэнні падвёў вынікі набору слухачоў на аддзяленне ў 1982-83 навучальным годзе, разгледзеў стан паспяховасці і наведвання заняткаў. Падведзены таксама і вынікі сацыялістычнага спаборніцтва факультэтаў па рабоце ФГП у першым паўгоддзі. Па выніках набору, наведвання заняткаў, выкарыстанню выпускнікоў і слухачоў ФГП у грамадскай дзейнасці, узроўню арганізацыйнай работы пераможцамі сталі юрыдычны, філалагічны, механіка-матэматычны факультэты.

І. ПІРОЖНІК,
дэкан ФГП.

### У ПЕРШЫНСТВЕ

ВНУ БССР па класічнай барацьбе, якое прайшло ў Мінску, каманда БДУ імя У. І. Леніна заняла II месца. Прызёрамі асабістага першынства сталі студэнт геаграфічнага факультэта А. Казлоў, студэнт фізічнага факультэта В. Бракарэнка і студэнт хімічнага факультэта У. Коршун.

В. РУДЗЯНКОЎ,
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

работы факультэцкіх камсамольскіх арганізацый за 1982 год. Месцы сярод факультэтаў размеркаваліся наступным чынам: механіка-матэматычны, юрыдычны, гістарычны, ФПМ, філалагічны, хімічны, радыёфізікі і электронікі, фізічны, біялагічны, геаграфічны, факультэт журналістыкі.

Ю. ВАРАТНІЦКІ,
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

### НА ПАСЯДЖЭННІ

савета па рабоце з замежнымі навучэнцамі абмеркаваны пытанні аб прафілактычнай рабоце па папярэджанню правапарушэнняў з боку замежных студэнтаў, аб арганізацыі зімовага адпачынку.

В. УЛАДЗІМІРАЎ.

### ЗІМОВЫЯ КАНІКУЛЫ

многія з замежных студэнтаў правядуць у Маскве, Адэсе, Ерэване, Баку, Кішынёве, паправяць здароўе ў доме адпачынку «Буг», міжнародным маладзёжным цэнтры «Юнацтва».

З. АЛЯКСАНДРАВА,
наш кар.

СТУДЭНТ І НАВУКА

# ПЕРАМОЖЦЫ ЎСЕСАЮЗНАГА

*Іх трое, студэнтаў-пераможцаў Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднаму маладзёжнаму руху: Міхаіл Жбанкоў — аддзяленне філасофіі, Карлас Дэльгада Дзіас (Куба) — аддзяленне філасофіі, Васіліу Дзімітрыас (Грэцыя)— аддзяленне палітэканоміі. Зараз ужо ўсе хваляванні, пытанні «на засыпку» засталіся ў мінулым. Наперадзе — Усесаюзная навуковая канферэнцыя, якая адбудзецца ў пачатку лютага ў Кіеве, дзе пераможцы выступяць з дакладамі. Тут не будуць прысвойваць работам катэгорыю, але рабяты ўсё роўна хвалююцца і рыхтуюцца да яе сур'ёзна. Наш карэспандэнт сустрэлася з пераможцамі конкурсу і папрасіла іх адказаць на некаторыя пытанні.*



**— Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна аб тэмах работ, якія былі прызнаны лепшымі. Як вы над імі працавалі?**

**Міхаіл ЖБАНКОЎ:**

— Тэма маёй работы—«Да праблемы станаўлення стылю навуковага мыслення Новага часу». Трэба адзначыць, што літаратуры непасрэдна па гэтаму пытанню амаль няма, і таму працаваць было надзвычай цікава. На мой погляд, навуковая работа ў тым і заключаецца, каб зрабіць нейкія вывады, выказаць свой пункт гледжання па гэтай праблеме, а не перапісваць матэрыял з падручнікаў. Даводзілася вывучаць і шмат сумежных пытанняў. І хаця на гэта пайшло нямала часу, але такая работа дала мне многа. І самае галоўнае, я навучыўся працаваць самастойна, хутка арыентавацца ў літаратуры, выбіраць факты найбольш значныя і каштоўныя. Нялёгка было часам. Але калі сустракаліся спрэчныя моманты, мне заўсёды дапамагаў мой кіраўнік — загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, прафесар Вячаслаў Сямёнавіч Сцепін. Разам падбіралі матэрыял, разам разбіраліся ў складаных пытаннях.

**Карлас Дэльгада ДЗІАС:**

Я працую над тэмай «Канцэпцыя рэвалюцыйнай партызанскай вайны Эрнэста Чэ Гевары ў святле ленінскіх выказванняў аб партызанскай вайне». Тэма пакуль мала даследаваная. І павінен адзначыць, што вельмі нязначная колькасць прац Чэ Гевары перакладзена на рускую мову. Самому даводзілася быць у якасці перакладчыка. А гэта надзвычай складана.

Працаваць над тэмай я пачаў на другім курсе. Яна лягла ў аснову маёй курсавой работы. Першыя крокі былі зроблены яшчэ тры гады назад. Заставалася толькі расшырыць напісанае. Але ажыццявіць гэта аказалася не так проста. Не хапала літаратуры, а таксама вопыту напісання навуковых работ. Здавалася, усё было правільна, зразумела, гладка, нарэшце. А падыходзіў да кіраўніка, дацэнта кафедры гісторыі філасофіі і логікі Міхаіла Іванавіча Іоські, і ён выносіў прысуд: «Не пераканаўча, не раскрыта тэма. А вось у гэтым месцы непрафесійны падыход да пытання». Пасля гэтага, шчыра кажучы, крыху псаваўся настрой, але працаваць браўся з яшчэ большым стараннем. Хацелася даказаць і сабе і Міхаілу Іванавічу, што я ўсё ж здолею раскрыць тэму.

**Васіліу ДЗІМІТРЫАС:**

— Мяне, як і кожнага грамадзяніна маёй Радзімы, хвалюе становішча рабочага класа ў Грэцыі. Яшчэ раней я чытаў многа літаратуры па гэтаму пытанню. А на другім курсе тэмай курсавой работы ўзяў «Абсалютнае і адноснае пагаршэнне становішча рабочага класа Грэцыі ў 50—70 гадах», якая потым і перарасла ў навуковую. З аднаго боку, пісаць яе было лёгка, таму што тэма была «родная», але не так проста аказалася зрабіць дакладныя тэарэтычныя вывады, абагульненні. У гэтым мне дапамагла мой кіраўнік, кандыдат эканамічных навук Валянціна Васільеўна Мігас.

**— А цяпер пытанне да цябе, Міхаіл. Я ведаю, што ты — член навуковага гуртка «Філосаф». Скажы, калі ласка, што карыснае дае табе ўдзел у гэтым гуртку?**

— Я б сказаў, што гурткі — апорныя цэнтры арганізацыі навуковай работы студэнтаў. Іменна тут студэнт вучыцца працаваць над першакрыніцамі, дапаможнікамі і іншай навуковай і метадычнай літаратурай. Гэта па-першае. І яшчэ, на мой погляд, адзін з галоўных плюсоў навуковых гурткоў у тым, што, выступаючы на канферэнцыях, мы вучымся свабодна трымацца перад аўдыторыяй (прысутныя не заўсёды з захапленнем глядзяць на цябе, а трэба даказаць ім, што ты зрабіў патрэбную справу). Тут мы вучымся хутка знаходзіць патрэбны і адзіна правільны адказ на пастаўленае пытанне, адкрываем новае для сябе і новае ў сабе.

Педагагічную практыку я праходзіў у політэхнічным тэхнікуме. Па плану патрэбна было праводзіць і лекцыі, і семінарскія заняткі. Студэнты задавалі шмат пытанняў, асабліва на семінарах. Згадзіцеся, спасылка на тое, што адкажу ў наступны раз, была не лепшым варыянтам. Трэба было знаходзіць адказ тут жа, на месцы. І я прыйшоў да вываду, што як бы ні быў падрыхтаваны, я не змог бы адказаць на ўсе пытанні, калі б не займаўся ў навуковым гуртку. Тут я атрымліваў шмат непраграмнага матэрыялу.

**— І апошняе пытанне: З якімі цяжкасцямі сустрэліся вы ў час напісання навуковай работы?**

**Карлас Дэльгада ДЗІАС:**

— Да паступлення ва універсітэт я год займаўся на падрыхтоўчым аддзяленні ў Гаване. Тут і пачаў вывучаць рускую мову. Але калі прыехаў у БДУ, то зусім дрэнна размаўляў па-руску. За пяць гадоў вучобы слоўнікавы запас папоўніўся. І ўсё ж, працуючы над навуковай работай, яшчэ раз пераканаўся, што рускую мову ведаю не зусім добра. Вось гэта і было, напэўна, самым складаным.

**Васіліу ДЗІМІТРЫАС:**

— Самым цяжкім для мяне з'явіўся падбор матэрыялу. Справа ў тым, што яго шмат, а трэба выбраць самае неабходнае, каштоўнае. Але я імкнуўся па магчымасці азнаёміцца з усёй асноўнай літаратурай па данай тэме. А то часам здаралася так, што на канферэнцыі табе задавалі пытанне, а адказ прызнаваўся няпоўным. Атрымлівалася так таму, што той, хто пытаўся, і ты чэрпалі інфармацыю з розных крыніц.

Хачу яшчэ сказаць, што праблемы з рускай мовай для мяне няма. На мой погляд, я ведаю яе дастаткова добра.

**Міхаіл ЖБАНКОЎ:**

— Я ўжо гаварыў, што літаратуры непасрэдна па тэме мала, і таму ў прачытанай трэба было знайсці тое, што датычыла непасрэдна данага пытання. А зрабіць гэта аказалася не так проста. Таму былі пэўныя праблемы са складаннем раздзелаў навуковай работы.

Пажадаем Міхаілу Жбанкову, Карласу Дэльгада і Васіліу Дзімітрыасу далейшых поспехаў у навуцы, паспяхова здаць дзяржаўныя экзамены і знайсці сваё месца ў жыцці.

Запісала З. АЛЯШКЕВІЧ.

**НА ЗДЫМКУ: пераможцы Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх навуках Міхаіл Жбанкоў, Карлас Дэльгада Дзіас і Васіліу Дзімітрыас.**

Фота У. Літоміна.

# СЕСІЯ, СЕСІЯ, СЕСІЯ...

## ПЕРАКЛІЧКА ФАКУЛЬТЭТАЎ

**Як справы! Гэта пытанне цяпер, бадай, самае распаўсюджанае ва універсітэце. І кожны, хто задасць яго, атрымае не звычайны адказ, маўляў, нічога, усё ў норме, а самы падрабязны, дакладны, з лічбамі і тлумачэннямі.**

**— Як справы? — хвалююцца аднакурснікі.**

**— Як справы? — цікавяцца ў дэканаце.**

**— Як справы! — першае, што хочуць ведаць бацькі, сустракаючы сыноў і дачок.**

**Зразумела — сесія, і навін — прыемных і не вельмі — не злічыць. І ўспамінаў пра шчаслівыя і нешчаслівыя білеты, складаныя і простыя задачы таксама будзе шмат. Але да ўспамінаў пакуль што далёка, а вось першыя вынікі падвесці ўжо можна. З гэтай мэтай мы і праводзім пераклічку факультэтаў. Яна стане своеасаблівым адказам на пытанне, якое стала зараз такім папулярным.**



На факультэце радыёфізікі і электронікі добра вялася падрыхтоўчая работа да сесіі. Акадэмічныя групы былі раздзелены на падгрупы па два-тры чалавекі ў кожнай. Студэнты разам вывучалі матэрыял да экзамена, прычым добра паспяваючыя дапамагалі адстаючым. Практыкавалася і так званая «рэпетыцыя экзамена»: тыя, хто падрыхтаваўся лепш, слухалі адказы сваіх таварышаў, давалі парады і тлумачэнні. Акрамя таго, вялікую ролю адыгралі і дакладна арганізаваныя кансультацыі выкладчыкаў. Дзякуючы разнастайным падрыхтоўчым мерапрыемствам вынікі, якія адлюстроўваюць ход сесіі, нядрэнныя: з чатырохсот студэнтаў, здаваўшых экзамены, 93 атрымалі выдатныя адзнакі, на «чатыры» і «пяць» здалі 213 чалавек, «здавальняюча» — у 47, адзнакай «нездавальняюча» былі ацэнены 18 адказаў. Працэнт паспяховасці на факультэце складае 95,0.

Падрыхтоўка да сесіі на хімічным факультэце праходзіла ў атмасферы дакладнасці і працавітасці. Непасрэдна ў перыяд экзаменацыйнай сесіі арганізавана дапамога адстаючым, даюцца кваліфікаваныя кансультацыі па прадметах. Экзамены здавалі 245 студэнтаў, адзнаку «выдатна» атрымалі 82 чалавекі, на «4» і «5» адказалі 114, «здавальняюча» — у залікоўках у 49, а «нездавальняюча» — у васьмі навучэнцаў. Працэнт паспяховасці — 95,8.

Самая вялікая колькасць студэнтаў здае экзамены на філалагічным факультэце. З 1133 чалавек, якія ўжо атрымалі адзнакі, 346 маюць «пяцёркі», 598 таксама дэманструюць нядрэнныя веды, у іх выдатныя і добрыя адзнакі, адказы 167 студэнтаў выкладчыкі ацанілі як здавальняючыя, а «двойкі» атрымалі 22 чалавекі. Працэнт паспяховасці складае 98,1.

Стабільныя, трывалыя веды ў студэнтаў гістарычнага факультэта. Зімовую экзаменацыйную сесію здавалі каля чатырохсот чалавек. На факультэце пакуль што толькі адна нездавальняючая адзнака. Працэнт паспяховасці традыцыйна высокі — 98,7. І гэта не выпадкова, таму што на факультэце на працягу ўсяго навучальнага года вялікая ўвага ўдзяляецца пытанням дысцыпліны, рэгулярнаму наведванню лекцый. Напрыклад, студэнты 3-га курса аддзялення гісторыі Віктар Саповіч, Іван Каравацкі, Лідзія Курыловіч пачалі здачу экзаменаў з выдатных адзнак. Трэба сказаць, што для гэтых студэнтаў «пяцёркі» не ў навінку, хутчэй, гэта ўжо стала правілам. Да таго ж, акрамя вучобы, яны актыўна займаюцца грамадскай работай: Віктар — староста курса, Іван — старшыня прафбюро факультэта, Лідзія — парторг курса.

Добра падрыхтаванымі прыйшлі да сесіі і студэнты біялагічнага факультэта. З 376 чалавек, што здавалі экзамены, на «выдатна» адказалі 135, на «выдатна» і «добра» — 210, «здавальняюча» — у 27, «двойкі» атрымалі — 8. Працэнт паспяховасці дасягнуў 97,9.

Аб ходзе сесіі на юрыдычным факультэце сведчаць наступныя даныя: з 566 адказваючых 191 чалавек атрымаў адзнаку «выдатна», «выдатна» і «добра» стаіць у залікоўках у 324 студэнтаў, «тройкі» — у пяцідзесяці, дзевяццю адказамі выкладчыкі не былі задаволены. Працэнт паспяховасці — 96,9.

Упэўнены ход экзаменацыйнай сесіі на фізічным факультэце ў значнай ступені абумоўлены нядрэннымі вынікамі заліковай сесіі. Толькі 16 студэнтаў мелі запазычанасць і не былі дапушчаны да здачы экзаменаў. Працэнт паспяховасці — 91,0.

Колькасць выдатнікаў на факультэце значна большая на старэйшых курсах, чым на малодшых. Гэта традыцыя пацвярджаецца вынікамі першага экзамена на 4-м курсе: 90 працэнтаў студэнтаў кафедры спектраскапіі і квантавай электронікі здалі экзамен па квантавай механіцы на «выдатна», а студэнты кафедры фізічнай оптыкі пры здачы экзамена па палітэканоміі «абышліся» без здавальняючых і нездавальняючых адзнак.

Працэнт паспяховасці на механіка-матэматычным факультэце складае 94,9. З 664 здаваўшых 171 атрымаў выдатныя адзнакі, «добра» і «выдатна» ў актыве ў 336 чалавек, адказы 127 студэнтаў выкладчыкі ацанілі як здавальняючыя, «двойкі» — у дваццаці студэнтаў.

Сесія на факультэце прыкладной матэматыкі праходзіць у зладжаным працоўным тэмпе. Своечасова адбываюцца кансультацыі выкладчыкаў, наладжана дапамога адстаючым. З тых 857 чалавек, якія здавалі экзамены, 149 адказалі на «пяць», 411 маюць адзнакі «выдатна» і «добра», «здвальняюча» атрымалі 297 студэнтаў, «нездавальняюча» — 31. Працэнт паспяховасці — 92,0.

Паспяхова праходзіць сесія на факультэце журналістыкі. Працэнт паспяховасці тут дасягнуў 98,6. Экзамены здавалі 147 чалавек, вышэйшай адзнакі заслужылі 72 студэнты, веды 69 ацэнены як добрыя і выдатныя, «здавальняюча» атрымалі 6 студэнтаў, нездавальняючых адзнак няма.

Выкладчыкі геаграфічнага факультэта слухалі адказы 312 студэнтаў, з якіх 69 атрымалі адзнаку «выдатна», 167—«добра» і «выдатна», 76 — «здавальняюча», 16 — «нездавальняюча». Працэнт паспяховасці — 94,2.

...Вось такія вынікі аднаго дня сесіі. Не ўсе яшчэ здадзены экзамены, не ўсе адзнакі атрыманы, многае наперадзе. Сесія працягваецца. Ні пуху, ні пер'я, студэнт!

**Падрыхтаваў М. ТАЛОЧКА.**

**● АГЛЯД ДРУКУ**

# Люстэрка нашых спраў

НЕ МНОЙ ЗАЎВАЖАНА: сведкай спраў факультэцкіх з'яўляецца насценны друк. Імення ён расказвае пра ўжо здзейсненыя мары і пра дарогі, якія яшчэ толькі клічуць. Пра справы сённяшнія і клопаты заўтрашнія. Таму газета — гэта і дарадчык, і настаўнік, і проста добры сябар, з якім можна падзяліцца сваімі думкамі.

Давайце пройдзем па паверхах галоўнага корпуса універсітэта, спынімся разам з іншымі студэнтамі ля стэндаў з «насценкамі» фізфака, мехмата і ФПМ.

Першае, чаго нельга не заўважыць, — усе насценгазеты значную частку сваёй плошчы адвялі матэрыялам, прысвечаным шасцідзесяцігадоваму юбілею нашай краіны. Рэдкалегіі многіх груп выпусцілі асобныя нумары, прысвечаныя адной з братніх рэспублік. Усе матэрыялы напісаны на даволі высокім узроўні і таму нездарма ля стэндаў з газетамі заўсёды людна.

Звернемся да трох насценных газет, якія з'яўляюцца органамі партбюро, дэканатаў і камітэтаў камсамола факультэтаў: «Рошым любую задачу» — мехмат, «Алгарытм» — ФПМ і «За навуку» — фізфак. Апошнюю з іх можна было б вылучыць як лепшую. Сапраўды, тут і разнастайная падборка матэрыялаў, якая шматбакова адлюстроўвае жыццё факультэта, знаёміць чытачоў з гісторыяй сваіх кафедраў, з выкладчыкамі і лепшымі студэнтамі. У матэрыяле «На халастым ходзе, або Праблемы сацыялістычнага спаборніцтва» аўтар закрануў пытанне наведвання студэнтамі заняткаў. Не стаіць у баку ад газеты і партыйная арганізацыя факультэта. Напрыклад, у адным з апошніх нумароў з перакануўчымі матэрыяламі па выніках трэцяга працоўнага семестра выступіў парторг кафедры агульнай фізікі І. В. Якіменка.

Разам з тым знешняму выгляду газеты ўласцівы шэраг недахопаў. Не мае сэнсу, напрыклад, многія матэрыялы друкаваць на каляровай паперы. Злоўжыванне «каляровымі артыкуламі» ператварае газетную паласу ў калейдаскоп, які цяжка не толькі чытаць, але і зрокава ўспрымаць. Не дапамагае чытачу і рэдакцыйная блытаніна паміж рубрыкай і загалоўкам. Вось, напрыклад, у апошнім нумары пад рубрыкай «Біяфізікі — Харчовай праграме» змешчаны заметкі трох студэнтаў, але ні адзін з іх не даў сваіму матэрыялу назвы. Пры афармленні газеты рэдакцыя не заўсёды ўмела карыстаецца і графічнымі сродкамі, каб выдзеліць тую ці іншую публікацыю.

Як паказала практыка, выступленні ў газеце супрацоўнікаў факультэта, выкладчыкаў не толькі робяць яе больш цікавай, але і дысцыплінуюць, прымушаюць пішучых студэнтаў з усёй адказнасцю адносіцца да слова. Пераходзячы да агляду выданняў мехмата і ФПМ, заўважым, што тут выпускам насценгазет займаюцца толькі студэнты. Можа таму і даводзіцца чуць ад іх такія скаргі: «Сярод студэнтаў мала ахвочых пісаць у газету. Усе яны, бачыце, вельмі занятыя...» Пры такім становішчы ўсё залежыць ад сумлення рэдкалегіі. Трапяцца энтузіясты — газета будзе выходзіць на патрэбным узроўні, а не... Але ўменне і энтузіязм — гэта яшчэ не ўсё. Вось, напрыклад, мехматаўская «насценка» «Рошым любую задачу» няўмела паставіла вядучы матэрыял нумара — даклад аб справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі. Ён нібыта «праваліўся ўнутр» паласы, задаўлены нейкай завірухай рознакаляровых ілюстрацый і навагодніх пажаданняў.

Хочацца зрабіць заўвагу па выкарыстанню на старонках «несценак» фотаздымкаў. Яны ўжываюцца ўсё часцей і часцей, але не заўсёды дастаткова эфектыўна. Вельмі часта яны падначалены мэце ўразіць, а не дапоўніць і праілюстраваць сур'ёзную думку.

Дарэчы, яшчэ адна агульная заўвага. На мехматаўскай газеце «Рошым любую задачу» стаіць парадкавы нумар 412, на фізфакаўскай «За навуку» — № 217, газета ФПМ наогул выйшла без нумара. У камітэце камсамола факультэта прыкладной матэматыкі паведамілі, што газета павінна абнаўляцца раз у месяц. Але вось да Новага года на працягу пяці тыдняў на стэндзе вісела толькі паведамленне аб справаздачнай камсамольскай канферэнцыі. Безумоўна, пытанні на канферэнцыі ўздымаліся важныя, аднак за імі не варта забываць і аб сённяшнім дні факультэта. Таму хіба нельга разам з агульнай лічбай ставіць у дужках парадкавую лічбу выхаду нумара ў бягучым годзе?

Закончыць аналіз студэнцкага друку хацелася б выпіскай з «насценкі» кафедры тэарэтычнай фізікі «Рэлятывісцкія навіны», дзе змешчана рэзалюцыя апошняга камсамольскага сходу: «...у бягучым годзе актывізаваць камсамольскую работу на кафедры, а таксама дабіцца рэгулярнага абмеркавання жыцця кафедры на старонках насценнай газеты...»

Хочацца, каб падобныя рашэнні былі рэалізаваны ва ўсіх факультэцкіх газетах.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

**● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ**

# Шчырая дапамога

33 ГАДЫ назад народ Індыі вызваліўся ад англійскага каланіяльнага прыгнёту. Маладая дзяржава адчувала патрэбу ў палітычнай, маральнай падтрымцы, у эканамічнай і навукова - тэхнічнай дапамозе.

Вялікі ўклад у справу падрыхтоўкі спецыялістаў для Індыі ўносіць і БДУ імя У. І. Леніна. 21 індыйскі студэнт закончыў падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян, некаторыя з іх вучыліся потым на асноўных факультэтах і з дыпломамі універсітэта паехалі на радзіму.

Закончыўшы падрыхтоўчы факультэт, Прадзіп Нахар паступіў на хімфак, а пасля заканчэння універсітэта быў рэкамендаваны для паступлення ў аспірантуру. За тры гады пад кіраўніцтвам члена - карэспандэнта АН БССР, прафесара І. Р. Цішчанкі ім была падрыхтавана кандыдацкая дысертацыя, якую П. Нахар паспяхова абараніў напярэдадні Новага года. Гэта другі спецыяліст вышэйшай кваліфікацыі, падрыхтаваны універсітэтам для Індыі.

9 выкладчыкаў універсітэта ў розныя гады выкладалі рускую мову ў навучальных установах Індыі. Вынікам работы ў Індыі старэйшага выкладчыка кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў асноўных факультэтаў У. Г. Будая стаў вучэбны комплекс па рускай мове для універсітэтаў Індыі, які быў створаны ім у сааўтарстве з выкладчыкамі Цэнтра рускіх даследаванняў універсітэта імя Дж. Неру ў Дэлі ў адпаведнасці з міжурадавым пагадненнем паміж СССР і Індыяй. Чатыры часткі комплексу выйшлі ў свет у выдавецтве «Русский язык» (Масква) у 1982 годзе. Зараз аўтарскі калектыў працуе над пятай часткай комплексу.

**Л. АЎСЯНКА,**
**дэкан па рабоце з замежнымі навучэнцамі.**

**На здымку:** П. Нахар абараняе кандыдацкую дысертацыю.



# УВАГА: КОНКУРС!

У СУВЯЗІ з падрыхтоўкай да 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў і 40-годдзя перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне прэзідыум Мінскага гарадскога савета таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры аб'явіў конкурс на лепшую студэнцкую работу аб помніках гісторыі і культуры.

На конкурс прымаюцца навуковыя работы студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў горада, тэматыка якіх звязана з вывучэннем, аховай і прапагандай помнікаў гісторыі і культуры.

Работы, рэкамèндаваныя на конкурс, павінны суправаджацца рашэннем адпаведных кафедр, студэнцкіх навуковых гурткоў і прадстаўляцца ў савет па НДРС універсітэта **не пазней 15 красавіка 1983 года.**

Для пераможцаў конкурсу ўстанаўліваюцца наступныя грашовыя прэміі:

першае месца (адно) — 50 рублёў;
другое месца (два) — 30 рублёў;
трэцяе месца (тры) — 20 рублёў
і 6 заахвочвальных прэмій па 10 рублёў.

Навуковыя кіраўнікі работ, прызнаных лепшымі, будуць узнагароджаны ганаровымі дыпломамі Мінскага гарадскога савета таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

**А. НІКІЦЕНКА,**
**намеснік старшыні савета па НДРС.**

# Шляхамі памяці

## РЭПАРТАЖ З МУЗЕЯ

**Вайна шалёным валам кацілася па савецкай зямлі. Вораг акупіраваў Прыбалтыку, Беларусь, Украіну, у пятлі блакады Ленінград. Фронт наблізіўся да сталіцы нашай Радзімы — Масквы.**

**Вайна выпрабоўвала савецкіх людзей на злом, на вернасць сацыялістычным ідэалам. І яны вытрымалі, не скарыліся...**

**Аб мужнасці і гераізме студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта ў гады Вялікай Айчыннай расказваюць шматлікія матэрыялы, сабраныя ў музеі гісторыі БДУ.**

У жніўні 1942 года выпускнік педагагічнага факультэта Фёдар Апацёнак пісаў у лісце да родных: «Учора мне Радзіма ўручыла зброю. Пачынае збывацца мая мара. Збіраюся першым увайсці ў свой родны горад».



Фёдар Апацёнак загінуў пад Смаленскам, але яго словы падхапілі, панеслі, пераплавілі ў грознае «ура!» тысячы і тысячы байцоў...

Па-рознаму склаўся лёс у тых, хто з-за студэнцкай парты, з універсітэцкіх аўдыторый і лабараторый пайшоў на фронт, уступіў у рады народных мсціўцаў.

Лётчыку-штурмавіку М. Я. Зайцаву давялося змагацца з ворагам у небе Украіны, вызваляць Польшчу, Чэхаславакію. Зрабіў 185 баявых вылетаў, збіў 2 фашысцкія самалёты, знішчыў 20 танкаў, 80 аўтамашын, 43 гарматы і мінамёты. Сёння Герой Савецкага Саюза Мікалай Якаўлевіч Зайцаў працуе ва універсітэце, перадае свае веды і багаты жыццёвы вопыт маладому пакаленню, юнакам і дзяўчатам васьмідзесятых.

З 1960 года выкладае ў БДУ імя У. І. Леніна прафесар Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі. У гарачым сорак чацвёртым ён разам з горсткай байцоў фарсіраваў Прут і мужна адбіваў варожыя атакі. Нават ранены, ён не пакінуў пазіцыю да той пары, пакуль не падышлі асноўныя сілы. За гэты бой ён атрымаў залатую Зорку Героя.

На стэндзе — партыйная характарыстыка малодшага сяржанта Аркадзя Іванавіча Ляўко. Лаканічны змест: «Да даручанай справы адносіцца па-бальшавіцку. У час баявых дзеянняў праводзіў вялікую выхаваўчую работу сярод асабістага саставу батальёна, у баі паказвае ўзор мужнасці...» За гэтымі словамі — пекла вайны, Сталінградская бітва, дзе маладому сувязісту 266-й дывізіі Аркадзю Ляўко давялося выпрабаваць і жудасныя варожыя бамбёжкі, і лютыя халады. А затым Краснадон, цяжкае раненне, шпіталь, Вісленскі плацдарм. Дзень Перамогі сустрэў у Празе...

Прыгожы дзявочы твар, мілыя вочы. Цяжка паверыць, што адно толькі яе імя выклікала ў фашысцкіх катаў дзікі жах і звярыную нянавісць. «Каця» (партызанская клічка Вары Вырвіч) узначальвала маладзёжны партызанскі атрад. За яе галаву ворагі абяцалі «3000 марак, 5 пудоў солі, а таксама зямельны надзел у 25 гектараў». Ды ці не танна куплялі?

Наведвальнікі музея даведаюцца таксама, што ў баях з ворагам вызначыліся былыя студэнты універсітэта, а цяпер вядомыя вучоныя А. А. Галаўко, А. В. Дулаў, Р. В. Булацкі, Т. І. Прытыцкая, М. Я. Цікоцкі, В. Ф. Чыгір, Г. М. Трухноў, пагартаюць старонкі кніг выпускнікоў БДУ В. Якавенкі, У. Парахневіча, У. Шахаўца, прысвечаныя незабыўным падзеям Вялікай Айчыннай.

Больш чым 450 студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў універсітэта змагаліся за свабоду і незалежнасць Савецкай Радзімы. Многія з іх назаўсёды засталіся ляжаць пад Масквой і на берагах Дняпра, у Польшчы і Чэхаславакіі, ля сцен пераможанага Берліна. І як светлая памяць аб іх подзвігу — жывыя кветкі ля помніка загінуўшым.

**А. БАРЫСАВА,**
**студэнтка журфака.**

● СПАТКАННЕ З ЦУДОЎНЫМ

# Арбіты «Крыжачка»

КАЛІ ГЛЯДЗІШ іх праграму, цяжка паверыць, што многія выканаўцы захапіліся харэаграфіяй толькі тут, ва універсітэцкім народным ансамблі танца «Крыжачок», якім кіруе Мікалай Вікенцьевіч Лапша, чалавек, улюбёны ў танец, захоплены прыгажосцю і цяжкасцю сваёй працы.

Гэты, цяпер ужо славуты самадзейны калектыў быў заснаваны ў 1947 годзе, а праз дваццаць гадоў, калі ансамбль атрымаў званне «народнага», перад калектывам паўстала пытанне аб выбары назвы. Пажаданні былі аднадушнымі: хай завецца «Крыжачком». З гэтага беларускага фальклорнага танца пачаўся сапраўдны поспех, з ім звязаны першыя ўдзячныя апладысменты, радасць і прызнанне гледачоў.

Сёння аб танцавальным ансамблі «Крыжачок» ведаюць ва ўсіх кутках Беларусі і далёка за яе межамі. Майстэрствам студэнцкага мастацкага самадзейнага калектыву захапляліся ў ГДР і Балгарыі, Польшчы і Аўстрыі, далёкай Анголе. Не толькі беларускія народныя танцы выконваюць «крыжачкоўцы». У іх рэпертуары «Венгерскі», «Закарпацкі», «Барыня», «Малдаўскі» і іншыя танцы. Сярод удзельнікаў ансамбля ёсць і тыя, хто ўжо скончыў універсітэт, але застаўся ў калектыве. Так, І. І. Млынчык, адзін з першых яго ўдзельнікаў, у «Крыжачок» трапіў выпадкова, танцаваць зусім не ўмеў. Зараз Іван Іванавіч — старшы выкладчык факультэта прыкладной матэматыкі, але, нягледзячы на занятасць, час для рэпетыцыі знаходзіць заўсёды.

Шматгадовая дружба звязвае «Крыжачок» з танцавальнымі калектывамі «Вяснянка» (педагагічны інстытут), «Флуераш» (Кішынёўскі універсітэт), «Дружба» (БПІ). Яны абменьваюцца вопытам, даюць адзін аднаму парады, дэманструюць новыя танцы. Гэта значыць, што «Крыжачок» працягвае свой шлях.

**Н. КАТКОВА,**
**студэнтка журфака.**



# Шукаць і знаходзіць

ПАСЛЯ ДЗЕСЯЦІГОДКІ перад Анатолем, як кажуць, «стодарог-шляхоў лягло». Было з чаго выбіраць: у школе ён аднолькава цікавіўся і літаратурай, і матэматыкай, і гісторыяй, прымаў удзел у алімпіядах па хіміі, захапляўся арніталогіяй. З гадамі захапленні не праходзілі а наадварот, набывалі форму цвёрдых перакананняў. Але быць адразу і шаўцом і жняцом складана, таму аддаў ён перавагу адной, навуцы старэйшай і мудрай.

Анатоль Пятровіч Салькоў па прызванню — вучоны, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі за 1982 г. Па спецыяльнасці — гісторык, па пасадзе — намеснік дэкана гістарычнага факультэта, дацэнт кафедры гісторыі СССР эпохі сацыялізму. Па характару... Калі сказаць працалюбівы — амаль нічога не сказаць, адзначыць абавязковасць і настойлівасць — адным-двума штрыхамі дапоўніць партрэт. Бадай, іменна спалучэнне гэтых якасцей плюс адказнасць, мэтанакіраванасць, патрабавальнасць да сябе і да іншых вызначаюць Анатоля Салькова.

Ён упэўнены, што спрадвечная спрэчка паміж фізікамі і лірыкамі наконт таго, «кто сегодня всех важней, всех полезней и нужней» ніякай крытыкі не вытрымлівае: «Кожны на сваім месцы робіць справу, патрэбную ўсім. А што да падзелу навукі на галоўную і другарадную, дык гэта памылковая думка».

Сапраўды, ці так ужо рэдка сустракаюцца масцітыя акадэмікі, што на «ты» з паэтычнай музай, і наадварот, служыцелі той самай музы, якіх цікавяць складаныя праблемы механікі ці тэрмадынамікі. Гісторыя, якой прысвяціў жыццё Анатоль Пятровіч,—не што іншае, як перапляценне, узаемапранікненне навук прыродазнаўчых і грамадскіх. Гісторыку цяжка працаваць у наш час без ведання сацыялогіі, палітэканоміі, матэматыкі і геаграфіі. Тым больш, калі чытаеш такі курс, як «гісторыя народнай гаспадаркі СССР».

Убачыць чалавека ў справе, у працы неабходнай і жаданай — амаль напалову зразумець яго. На жаль, мне не давялося прысутнічаць на лекцыях Салькова — універсітэт жыве экзаменацыйнай сесіяй. Я магу меркаваць аб яго педагагічных, арганізацыйных і чалавечых якасцях па водгуках таварышаў. Загадчык кафедры, дацэнт Іван Апанасавіч Літвіноўскі адзначае ў Салькове перш за ўсё сур'ёзны, удумлівы падыход да любой справы, яго імкненне не адкладваць штонебудзь на заўтра, на потым. Дацэнт Леў Антонавіч Міхайлоўскі — уменне выдзеліць у навуковым пошуку галоўнае, сувязное звяно. Сціпласць, таварыскасць, выдатныя арганізатарскія здольнасці — калега Салькова Валянцін Адамавіч Андруховіч...

Аднак усё мае першаснову. Сёмы клас Анатоль закончыў з некалькімі чацвёркамі. Тады ж паставіў перад сабой мэту вучыцца толькі на выдатна. Так і займаўся: і ў школе, і ва універсітэце.

З першага курса захапіўся навуковай работай. І хоць часу вольнага было мала, абкладжыўся літаратурай па гісторыі, эканоміцы і палітычнай эканоміі, даведнікамі, дапаможнікамі. Сталі цеснымі рамкі універсітэцкай праграмы — выйшаў на шлях вялікай навукі. Праз некалькі гадоў работа студэнта чацвёртага курса гістарычнага факультэта Анатоля Салькова была аднесена да першай катэгорыі на Рэспубліканскім конкурсе грамадскіх навук. Трэба сказаць, што як па аб'ёму, так і па глыбіні распрацоўкі тэмы яна не ўступала сур'ёзнай навуковай працы.

У 22 гады закончыў Анатоль універсітэт і застаўся працаваць выкладчыкам на гістарычным, завочна вучыўся ў аспірантуры. Цанілі ў ім веданне справы, шырыню натуры, шчодрасць. І яшчэ тое, што можна адной фразай назваць: сучаснасць мыслення.

А каб час не траціць дарма — Салькоў зноў у навуку: з групай сацыёлагаў узяўся за складанне пяцігадовага плана сацыяльна - эканамічнага развіцця Мінскага станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава.

— Вось тут — у каторы ўжо раз! — спатрэбіліся дакладнасць матэматыкі, універсальнасць сацыялогіі, скурпулёзнасць статыстыкі,— расказвае Анатоль Пятровіч.

На пытанне аб захапленні навукай наогул, а гісторыяй у прыватнасці адказаў:

— Быць матэматыкам можна ўжо ў дванаццаць гадоў, фізікам — таксама. А вось гісторыкам у такім юным узросце быць нельга. Патрэбна адчуць жыццё, выпрацаваць цвёрдае ўяўленне аб тых ці іншых грамадскіх працэсах.

— Ну, а калі проста, па натхненню?

— Дарэмныя мары!

Пачуўшы такія словы, праніклівы чытач паспрабуе намаляваць для сябе дакладны партрэт Анатоля Пятровіча. Ды толькі наўрад ці будзе сам ён згодзен з такім, прама скажам, аднабаковым падыходам: выкладчык, вучоны, адміністратар. Ён аднолькава ахвотна цікавіцца філасофіяй і педагогікай, музыкай і жывапісам, захапляецца паэзіяй, мае цікавую бібліятэку... Здавалася б, для чалавека, поўнасцю адданага вучэбнай і навуковай дзейнасці, на іншыя справы проста фізічна не хапіла б часу. Салькоў так не лічыць, а таму каторы ўжо год узначальвае групу навуковых кансультантаў у КМА БССР, з'яўляецца няштатным інструктарам ГК партыі па аддзелу навукі і навуковых устаноў горада, адказным сакратаром міжвузаўскага зборніка «Пытанні гісторыі»...

Чалавек нараджаецца, каб сумнявацца і верыць, шукаць і знаходзіць, каб быць карысным грамадству. А інакш і жыць немагчыма.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**наш кар.**

СПОРТ

ПЕРШЫНСТВА універсітэта па шашках было апошнім спаборніцтвам у семестры па праграме спартакіяды. Яно пачалося ў снежні мінулага года, а закончылася ў студзені.

Толькі восем факультэтаў выставілі свае шашачныя дружыны. Не было каманд філалагічнага, біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў. Шчыра кажучы, яны не прэтэндавалі на высокія месцы, шашкі не з'яўляліся іх заліковым відам.

## Мацнейшыя вядомы

Новае палажэнне аб правядзенні спартакіяды не абмяжоўвае ўдзел супрацоўнікаў у ёй. Гэта выкарысталі некаторыя каманды: напрыклад, за хімічны факультэт гуляла шэсць супрацоўнікаў, і ён быў рэальным прэтэндэнтам на перамогу. Каманда даволі лёгка перамагла сваіх сапернікаў, спатыкнуўшыся ў матчы з камандай факультэта радыёфізікі і электронікі, які прайграла з лікам 3:4. Тым не менш да апошняга матча хімікі ўзначальвалі табліцу.

Матч каманды хімфака з мінулагоднім чэмпіёнам—камандай ФПМ стаў рашаючым у турніры. Шашысты ФПМ былі больш уважлівыя і выйгралі 5,5:1,5. ФПМ зноў выйшаў пераможцам, набраўшы 35 ачкоў. Дарэчы, на першай дошцы пераможцам выйшаў супрацоўнік ФПМ, майстар спорту СССР І. В. Беляеўскі, які ў асабістай сустрэчы выйграў у супрацоўніка хімфака, кандыдата ў майстры спорту СССР М. Р. Рафальскага, заняўшага другое месца.

У апошнім туры сустракаліся каманды механіка - матэматычнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі. Перамог мехмат — 4:3 і, набраўшы 30,5 ачка, адцясніў хімфак на трэцяе месца.

Прыводзім табліцу першынства універсітэта па шашках (у табліцы ўказаны ачкі, якія ідуць у залік спартакіяды):

1. ФПМ (180)
2. Мехмат (150)
3. Хімфак (120)
4. Факультэт радыёфізікі і электронікі (90)
5. Юрфак (80)
6. Фізфак (70)
7. Гістфак (60)
8. Журфак (50)

**Н. ТРУБЧЫК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

СПОРТ

# ДУША КАМАНДЫ

15 ГАДОЎ назад прыйшла працаваць выкладчыкам універсітэта Людміла Аляксееўна Капылова. Майстар спорту СССР па лыжах. Чалавек, які любіць сваю справу, яна не магла сядзець, склаўшы рукі. Вырашыла стварыць секцыю лыжных гонак. Прайшла па факультэтах, пазнаёмілася з рабятамі, запрасіла ўсіх жадаючых. Рабят прыйшло многа. Але праз некалькі заняткаў рады лыжнікаў парадзелі, а праз месяц укамплектавалася каманда, якая гатова была працаваць сур'ёзна, выконваць любыя нагрузкі, каб потым паспяхова абараняць гонар роднага універсітэта.

Жыццё рабят стала больш цікавым, часу вольнага паменшылася, але ніводнаму з іх не патрэбна было шукаць, чым заняцца. Кожны дзень прыносіў радасць ад таго, што на трэніроўках ты працаваў добрасумленна, што на самым складаным участку пераадолеў сябе і перамог.

У спорце хлопцы і дзяўчаты станавіліся дарослымі, вучыліся сапраўднаму калектывізму, сапраўднай спартыўнай дружбе і, зразумела, лыжнаму майстэрству.

Што прыцягвала іх у каманду? Іх вабілі спартыўныя вышыні, вабілі тыя адносіны, якія былі ў камандзе. А душой яе была Людміла Аляксееўна. Цяпер, калі прайшло нямала часу і тыя першыя юнакі і дзяўчаты даўно закончылі універсітэт, яны з цеплынёй успамінаюць цудоўныя гады. І толькі паявіцца вольная мінута, яны бягуць на лыжную базу, каб пагутарыць з трэнерам. Алег Баравы, Галя Цябус, Яўген Гарыд, Яўгенія Рашкевіч, Гена Варанцоў — гэта яны былі пачынальнікамі традыцый, якія існуюць і сёння. Не толькі аднымі трэніроўкамі і спаборніцтвамі жыве каманда. Ужо сталі традыцыйнымі вечары-сустрэчы, калі пасля летніх канікулаў на базе збіраюцца лыжнікі ўсіх пакаленняў.

Нішто так не загартоўвае лыжнікаў, як спаборніцтвы. Вось дзе праяўляецца сапраўдны калектывізм! Як хвалююцца, перажываюць рабяты. Не, не за сябе, а за таго, хто яшчэ на дыстанцыі. І як радуюцца перамозе кожнага.

Пройдзе час, пакінуць каманду Віктар Варанскі, Сяргей Рашко, Ларыса Баркова, Алена Капылова, Света Сяргеева, на змену ім прыйдуць зусім юныя хлопцы і дзяўчаты, і яны будуць падтрымліваць тыя традыцыі, што нарадзіліся раней і жывуць зараз...

**А. ДАНІЛЬЧАНКА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## ПРАДСТАЎЛЯЕМ ЧЭМПІЁНАЎ

### БАРАЦЬБА КЛАСІЧНАЯ

да 48 кг — **С. Тыршкоў** (факультэт радыёфізікі і электронікі);
да 57 кг — **А. Плюшч** (фізфак);
да 62 кг — **І. Германовіч** (юрфак);
да 68 кг — **В. Белавусаў** (юрфак);
да 74 кг — **В. Караканіца** (геафак);
да 82 кг — **А. Зімоўскі** (геафак);
да 90 кг — **С. Байда** (юрфак);
да 100 кг — **М. Рубіс** (юрфак);
звыш 100 кг — **А. Казлоў** (юрфак).

### БАРАЦЬБА ДЗЮ-ДО

да 60 кг — **Ю. Камароў** (юрфак);
да 65 кг — **В. Дуднік** (геафак);
да 71 кг — **А. Талканіца** (факультэт радыёфізікі і электронікі);
да 78 кг — **Ю. Брыткоў** (гістфак);
да 86 кг — **А. Макрыцаў** (юрфак);
да 95 кг — **В. Матарас** (юрфак);
звыш 95 кг — **А. Матылькоў** (юрфак);
абсалютная — **В. Матарас** (юрфак).

СПОРТ



*БОЛЬШ ЯК 20 гадоў назад закончыла Валянціна Аляксандраўна Другаль рамеснае вучылішча і прыйшла працаваць у друкарню БДУ імя У. І. Леніна. Зараз яна — ветэран, усімі паважаны чалавек.*

*— Добра ведае сваю справу, сціплая, чулая жанчына, — гаворыць пра Валянціну Аляксандраўну дырэктар друкарні В. М. Шкурдзюк.*

*— Заўжды прыйдзе на дапамогу, падкажа, дзе трэба,— дадаюць малодшыя таварышы.*

*Наборны цэх, у якім працуе В. А. Другаль, нагадвае хутчэй за ўсё ўтульную дамашнюю майстэрню, старанна абсталяваную гаспадарамі. Нават цяпер, калі на вуліцы зіма, тут — куточак вясны, цвітуць кветкі! А яшчэ добразычлівай атмасферай вызначаецца калектыў цэха. Таму і не дзіўна, што невялікая група наборшчыкаў, членам якой з'яўляецца Валянціна Аляксандраўна Другаль, некалькі год запар узнагароджваецца пераходным вымпелам за высокія паказчыкі ў сацыялістычным спаборніцтве.*

*У. АБРАМОВІЧ,*
*студэнт факультэта журналістыкі.*
Фота **В. Шачака.**

ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

## Права грамадзян на затрыманне злачынца

**Пад рэдакцыяй прафесара І. С. Цішкевіча**

У АДПАВЕДНАСЦІ з артыкулам 15 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 ліпеня 1966 года «Аб узмацненні адказнасці за хуліганства» ўчынкі грамадзян, накіраваныя на затрыманне злачынцаў, з'яўляюцца правамернымі і не падпадаюць пад крымінальную ці іншую адказнасць, нават калі была вымушана прычынена шкода злачынцу. Пленум Вярхоўнага суда СССР тлумачыць, што крымінальная адказнасць за прычыненне шкоды злачынцу пры яго затрыманні можа быць тады, калі дзеянні, якія прычынілі шкоду злачынцу, не з'яўляліся неабходнымі для яго затрымання, не адпавядалі характару і небяспецы здзейсненага злачынства і абставінам затрымання. У гэтым выпадку затрымліваючы падлягае адказнасці за забойства ці прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання пры перавышэнні межаў неабходнай абароны.

Аднак патрэбна ўлічваць, што прычыненне шкоды з мэтай затрымання можа быць прызнана правамерным толькі пры затрыманні злачынца, а не любога іншага правапарушальніка.

Прычыненне цялесных пашкоджанняў асобе, якая здзейсніла адміністрацыйны ці дысцыплінарны праступак, цягне адказнасць на агульнай падставе. Напрыклад, за цяжкае цялеснае пашкоджанне асуджаны вартаўнік Р., які пры затрыманні непаўналетняга П., украўшага з калгаснага стогу вязку саломы, стрэлам з ружжа нанёс яму раненне.

Але калі асоба, што здзейсніла правапарушэнне, якое не з'яўляецца злачынствам, у адказ на законнае патрабаванне ісці ў адпаведны орган улады ці штаб народнай дружыны з мэтай пазбегнуць затрымання нападае на затрымліваючага, то ў апошняга ўзнікае права на неабходную абарону.

Прадугледжанае законам права кожнага грамадзяніна затрымліваць злачынцу мае самастойны характар. Гэта азначае, што грамадзяне могуць ажыццявіць такое права, не звяртаючыся за дапамогай да органаў улады і незалежна ад таго, ёсць магчымасць звяртацца за такой дапамогай ці не. Аднак, затрымаўшы злачынцу, у максімальна кароткі тэрмін пацярпеўшы ці іншая асоба павінны перадаць яго органам улады.

Калі шкода злачынцу прычыняецца не з мэтай затрымання, а для помсты — самачыннай расправы, наступае адказнасць за звычайнае наўмыснае злачынства.

**Л. ГРЫЦАЛЬ,**
**студэнтка III курса юрыдычнага факультэта.**



*У зімовым парку.* *Фотаэцюд В. ШАЧАКА*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
27 студзеня 1983 г.
Зак. 174. АТ 04050

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ